ЗРУЧНАЯ СУВЯЗЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 13-й стар. «МС».)

— Нярэдка пацвярджаліся факты фармалізму і валакіты ў рабоце камунальнікаў, — сведчыць спецыяліст. — Летась у 25 выпадках вінаватыя былі прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці, а кіраўнік ЖЭУ № 7 у Магілёве наогул вызвалены ад займаемай пасады.

На другім месцы па колькасці пытанні працы і заробку. Людзі просяць дапамагчы ім знайсці работу, скардзяцца на несвоечасовае налічэнне і выдачу зарплаты, асабліва ў сельскагаспадарчых арганізацыях. «У сямі выпадках вінаватыя былі прыцягнутыя да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці», — удакладняе Наталля Дашкова.

Галоўны спецыяліст Наталля ДАШКОВА.

> У аблвыканкам часта тэлефануюць жыхары, якія ў свае мясцовыя органы ўлады нават не звярталіся.

Стала больш прэтэнзій па архітэктуры і будаўніцтве. Заяўнікі часцей сігналізуюць пра парушэнні меж участкаў, самавольныя пабудовы або пра тое, што будаўніцтва вядзецца вельмі блізка да іх уладанняў. Некаторыя грамадзяне сведчаць, што купілі на аўкцыёне дом, а навокал — ніякай інфраструктуры. Уздымаецца праблема якасці вады. «Такія звароты застаюцца на кантролі, бо адразу вырашыць іх не заўсёды атрымліваецца, — тлумачыць спецыяліст. — Пэўны час жыхары пасёлка Новае Пашкава скардзіліся на нездавальняючы стан пітной вады. Было прынятае рашэнне закальцаваць водаправодныя сеткі населенага пункта з магілёўскімі — абстаноўка адразу ж палепшылася. Аналагічная праблема зараз у пасёлку Чаромушкі. Яе будуць вырашаць па такой жа схеме».

Актуальнай застаецца тэма сацыяльнага і пенсійнага забеспячэння. Значна павялічылася колькасць зваротаў па ахове здароўя. Заяўнікі незадаволены арганізацыяй медыцынскага абслугоўвання, немагчымасцю трапіць на прыём да вузкага спецыяліста, асабліва на раёне. З-за недахопу медыцынскага абсталявання няма магчымасці хутка прайсці пэўныя працэдуры накшталт МРТ, УГД.

Турбуюць насельніцтва вобласці таксама пытанні работы транспарту (крыўдна, калі аўтобус праязджае міма твайго населенага пункта без спынення), аграпрамысловага комплексу (здатчыкі малака лічаць, што ім заніжаюць тлустасць іх прадукту), гандлю, органаў унутраных спраў, адукацыі і навукі, культуры і спорту, інфармацыі і сувязі. Па кожным са зваротаў атрыманы адказы, прычым па 378 прыняты станоўчыя рашэнні.

Аматары ставіць пытанні

Ёсць ва ўпраўленні асобная папка са спісам грамадзян, якія неаднаразова звярталіся на «суботнія» лініі. Дасье зроблена выключна дзеля таго, каб не выконваць бессэнсоўную работу. Гэтыя людзі часцей за ўсё задаюць адно і тое ж пытанне. Ім ужо быў дадзены адказ, але яны спадзяюцца, што такім чынам дамогуцца рашэння, якое іх больш задаволіць.

— Заканадаўствам прадугледжана: калі заяўнік звяртаўся і атрымаў аргументаваны адказ, перапіска з ім можа быць прыпынена, — тлумачыць Наталля Дашкова. — На сёння ў спісе 23 прозвішчы. І мы яго пастаянна актуалізуем. Ёсць там таксама людзі, якія рэгулярна тэлефануюць, але кожны раз ставяць новыя пытанні. Карыстаюцца тым, што такая форма работы вельмі зручная.

> Нярэдка аблвыканкам выконвае пасрэдніцкія функцыі паміж чалавекам і арганізацыяй, да якой адрасуецца пытанне. Хоць у Магілёве працуе адзіная дыспетчарская служба 115. Не трэба запамінаць тэлефоны ЖЭУ, ЖРЭУ — любое пытанне па камунальнай гаспадарцы вырашаецца па гэтым тэлефоне. Але людзі ўсё роўна чакаюць суботы, тэлефануюць і скардзяцца. Між тым вырашыць пытанне можна было значна раней.

Найбольш актыўныя скаржнікі — магіляўчане (46 % ад агульнай лічбы), на другім месцы — жыхары Магілёўскага раёна і Бабруйска. Летась у параўнанні з папярэднім годам паменшылася колькасць зваротаў з Асіповіцкага, Кіраўскага, Шклоўскага і Чэрыкаўскага раёнаў. Сельскія выканаўчыя камітэты таксама праводзяць прамыя лініі, але званкі да іх паступаюць на мабільны тэлефон. Гэта зроблена для таго, каб не прывязваць прадстаўніка сельскай улады да кабінета. У яго, у адрозненне ад вышэйстаячых калег, акрамя кіраўніка справамі, ніякіх памочнікаў няма.

Лятучы атрад

Акрамя вусных, існуюць яшчэ пісьмовыя і электронныя звароты, а таксама тыя, што разглядаюцца падчас асабістых прыёмаў. Летась іх паступіла ў аблвыканкам больш чым 2900. Бывае, што заяўнік патэлефанаваў, а потым яшчэ прыйшоў або напісаў. Усе гэтыя сігналы рэгіструюцца, і па іх пачынаюць працаваць спецыялісты — супрацоўнікі ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб. У Магілёўскім аблвыканкаме такіх усяго пяць.

— І ўсе любяць сваю работу. За кожным лістом, званком — праблема чалавека. Ён жа не проста дзеля забавы вырашыў да нас звярнуцца, нешта сапраўды яго турбуе. І мы павінны яму дапамагчы, — кажа Наталля Дашкова.

Выпадкі бываюць розныя: здараецца, звоніць нехта раззлаваны, пачынаеш з ім па-добраму размаўляць, і чалавек супакойваецца... Супрацоўнікі нашага ўпраўлення — стрэсаўстойлівыя людзі, мы жартам называем сябе «лятучы атрад». І тое, што 36 % зваротаў з тых пытанняў, якія паступалі летась на суботнюю тэлефонную лінію, вырашыліся станоўча, лічы, і наша заслуга.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ФОРМА І ЗМЕСТ

САМАЯ ДАКЛАДНАЯ КРЫНІЦА ІНФАРМАЦЫІ

Мясцовыя дэпутаты падтрымалі ініцыятыву актывіста

— Адна з галоўных нашых задач — работа з насельніцтвам. Формы яе разнастайныя. Але, бадай, самымі важнымі з'яўляюцца сустрэчы з жыхарамі горада і раёна (сходы), прамыя тэлефонныя лініі, асабістыя прыёмы грамадзян. Апошнія ажыццяўляюцца нашымі дэпутатамі штомесяц. Графікі іх апублікаваныя на афіцыйным сайце Вілейскага райвыканкама, — уводзіць у курс справы старшыня Вілейскага раённага Савета дэпутатаў Алена ЧАБАТАР.

У 2018 годзе ў райсавет паступіла 23 пісьмовыя звароты грамадзян і юрыдычных асоб, 2 электронныя і 28 вусных. У асноўным яны датычыліся вызвалення ад пералічэння ў раённы бюджэт сродкаў, атрыманых ад здачы ў арэнду будынкаў, збудаванняў і іншых памяшканняў, а таксама вызвалення ад падатку на нерухомасць або змяншэння ставак павышаючага каэфіцыента на яе і зямельнага падатку. У выніку тры прадпрыемствы вызвалены ад пералічэння ў раённы бюджэт сродкаў ад здачы ў арэнду будынкаў, збудаванняў і іншых памяшканняў.

Хвалявалі людзей і такія пытанні, як капітальны рамонт жылых дамоў, работа грамадскага транспарту, уладкаванне дарог, водазабеспячэнне, працаўладкаванне.

Тыя звароты, якія патрабавалі дадатковага вывучэння, разгледжаны спецыялістамі з выездам на месца. Усе заяўнікі атрымалі адказы. Пытанні, па якіх яшчэ не надышлі тэрміны, знаходзяцца на кантролі ў раённым Савеце дэпутатаў.

За мінулы год вілейскія дэпутаты сапраўды вырашылі шмат пытанняў па паляпшэнні жыццядзейнасці жыхароў горада і раёна. У вёсцы Казлы Ільянскага сельсавета адрамантавана дарога; наладжана бесперабойнае забеспячэнне гарачай вадой жыхароў вуліцы Гагарына, адрамантаваны дах дома па вуліцы Кастрычніцкай у Вілейцы. Па просьбе людзей зменены маршруты аўтобуса Вілейка — Ваўкалатка з дадатковым заездам у аграгарадок Ерхі. Цяпер значна прасцей і зручней стала дабірацца ў вёску Ізбіно Асіпавіцкага сельсавета — аўтобусы № 1 і № 5 сталі заходзіць у гэты населены пункт. А жыхар вёскі Порса Любанскага сельсавета ўдзячны дэпутатам за тое, што пры іх непасрэдным хадайніцтве ўдалося вырашыць праблему адводу вады з зямельнага ўчастка.

Жыхары пасёлка Ілья звярнуліся ў сельсавет з прапановай аднавіць вадаём, які раней быў месцам адпачынку, а цяпер у выніку пэўных прычын абмялеў. Сельвыканкам падтрымаў ініцыятыву. Ёсць надзея, што ў недалёкай перспектыве возера будзе адноўлена талакой. Работы вядуцца за сродкі саміх жыхароў, аказвае дапамогу і мясцовая гаспадарка.

На сесіі райсавета дэпутат Андрэй Стасевіч прапанаваў падтрымаць ініцыятыву мясцовага прадпрымальніка Віталя Малыша і просьбу мясцовых жыхароў па зборы сродкаў на рамонт так званага

> Хвалявалі людзей і такія пытанні, як капітальны рамонт жылых дамоў, работа грамадскага транспарту, уладкаванне дарог, водазабеспячэнне, працаўладкаванне.

Фота носіць ілюстрацыйны характар. mlyn.by

Казінага моста цераз раку Вілію, які быў змыты падчас веснавога разводдзя. У крамах былі ўстаноўлены спецыяльныя скрыні. Адгукнуліся на заклік актывіста як жыхары Вілейкі, так і мясцовыя арганізацыі, спонсары... Калісьці Казіны мост меў, можна сказаць, стратэгічнае значэнне для гараджан. Продкі сучасных віляйчан трымалі на падворках шмат коз. Спачатку іх перавозілі на супрацьлеглы бок ракі, багаты на сакавітыя травы, на лодках, а затым сваімі сіламі пабудавалі драўляны мост, па якім пераганялі жывёлін на пашу. Цяпер ён страціў сваё першапачатковае прызначэнне, але гэты мост з'яўляецца своеасаблівым сімвалам Вілейкі. Ды і гараджанам ён патрэбны: хтосьці сюды прыходзіў вудзіць рыбу, нехта проста адпачыць, а некаторыя жыхары хадзілі гэтай дарогай па ягады і грыбы. Цяпер жа даводзіцца пераадольваць шлях у шмат кіламетраў, каб трапіць у лес.

Будаўніцтва моста патрабуе шмат высілкаў, бо з цягам часу заканадаўства мянялася, станавілася больш жорсткім: яно прадугледжвае шматлікія працэдуры, узгадненні з зацікаўленымі службамі. Распрацоўка праекта абыдзецца, відаць, даражэй, чым само ўзвядзенне пешаходнай артэрыі. Дзе ж выйсце? Як прапаноўвае Андрэй Стасевіч, можна пайсці па найбольш простым шляху — звярнуцца па дапамогу ў Міністэрства абароны, у практыцы якога ёсць прыклады будаўніцтва такіх сацыяльных мастоў у краіне...

— Работа са зваротамі грамадзян была, ёсць і будзе адной з галоўных у дзейнасці дэпутатаў усіх узроўняў і кіраўнікоў, — лічыць Алена Чабатар. Таму што людзі, якія жывуць на Вілейшчыне, — самая лепшая і дакладная крыніца інфармацыі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.